# ІЛЮМІНАЦЫІ

Прысеў на траву ля дарогі запісаць нешта ў нататнік і амаль адразу пачуў дабразычлівы голас прахожага: “Прыпынку тут ужо няма, перанесьлі далей!”. Там, дзе я пішу, аўтобусы цяпер не спыняюцца.

* * *

У салёне прыгараднага аўтобуса часам складана ня тое што кінуцца ў скокі, а проста ўстаць на сваю ж другую нагу. Тут разумееш, навошта нам патрэбны сучасьнікі. Шчыльнасьць натоўпу пазбаўляе чалавека свабоды, але менавіта яна дазваляе нам верыць, што мы жывем вэртыкальна, галавою ў неба. Можна нават не трымацца за парэнчы на паваротах.

* * *

На ўсялякі выпадак ня стаў выкідаць з партманэ стары праязны: раптам да прыпынку падыдзе мінулагодні аўтобус?

* * *

Лепшае, што можа зрабіць у сваім жыцьці айсбэрг, — гэта сустрэцца з “Тытанікам”.

* * *

Вецер даносіць аднекуль здалёк, з-за шматпавярховых дамоў, ледзь чутныя ўрыўкі музыкі. Цяжка зразумець, таньчаць там альбо нясуць каго да магілы.

* * *

Кіроўца катафалку ведае горад ня горш за таксыста.

* * *

Для тых, хто думае пра нас з далёкае будучыні, мы ўжо мёртвыя. Але для тых, хто спрабуе ўявіць нас зь мінуўшчыны, мы яшчэ нават не нарадзіліся.

* * *

Перад тым як нарадзіцца, замест вопраткі мы носім уласную маці.

* * *

Нашыя веды і нават самое жыцьцё мы, напэўна, атрымліваем ад нашчадкаў, а продкі — гэта нешта накшталт антэны.

* * *

“Залатая” даўніна насамрэч была толькі зьлёгку пазалочаная: калі б усё там было добра, мы дагэтуль там і жылі б.

* * *

Рукі стаміліся. Кашуля прамокла. Хтосьці з нас не вытрымлівае:

— Хоць бы што добрае адкапаць, збанок які-небудзь з манэтамі, а то ўсё гліна ды гліна...

— І тое ўжо добра, што не магілу капаем.

* * *

Навуцы дагэтуль невядома, хто ўзарваў першасны згустак матэрыі, зь якога нарадзіўся сусьвет. Кажуць, сапёр памыляецца толькі аднойчы — дык ці ня той Вялікі Выбух маецца на ўвазе?

* * *

Усялякая праўда трымаецца, колькі хопіць сілаў, на падмане, а потым б’е людзей па галаве.

* * *

Найлепшыя шанцы застацца сабою мае той, хто не трымаецца за ўласнае “Я”. Мабыць, яшчэ ніводны чалавек ня зьехаў з глузду ўва сьне.

* * *

Каб зьмяніць сьвет да лепшага, дастаткова ўявіць яго сабе як тэатр і паставіць у ім уласную п’есу.

* * *

Часам страшна бывае сядаць на ўнітаз: а раптам ад цябе нічога не застанецца?

* * *

Калі займаесься чымсьці ўсур’ёз, часта атрымліваецца толькі вынік, а больш нічога добрага.

* * *

Надзеі спраўджваюцца гэтак жа рэдка, як і ўспаміны.

* * *

Мы ня толькі чытаем адны й тыя самыя кнігі зь бібліятэкі, але і бачым па чарзе агульныя сны.

* * *

Мастак выбірае аптымальны фармат для карціны залежна ад сюжэту, стылю, матэрыялу. Тэатральная пастаноўка таксама зьдзяйсьняецца ў разьліку на пэўнае памяшканьне, якое ня будзе для яго надта цёмным альбо завялікім. І ўсе войны, сацыяльныя рэвалюцыі, вырубка лясоў і павароты рэк — гэта пошукі аптымальнай геаграфіі для зямной гісторыі.

* * *

Што будзе пасьля канца сьвету: рэклямная паўза — і наступная сэрыя?

* * *

Таталітарная ўлада мае практычна неабмежаваныя жывыя рэсурсы і таму вырашае свае задачы ня якасьцю, а колькасьцю працоўнага мяса.

* * *

Калі “кожнаму — сваё”, то каму астатняе?

kamunikat.org

* * *

Дзеці хутчэй навучаюцца той мове, якая здаецца ім саладзейшаю. Мы размаўляем з пляменьніцай: яна сядзіць насупраць, смокча карамельку і па чарзе паказвае мне то свой сапраўдны язычок, то акрайчык цукеркі. Проста білінгвізм нейкі.

* * *

Калі мы ня можам адваяваць радзіму ў нашых суседзяў, то павінны стварыць яе самі.

* * *

Паказваць “атавістычныя” нацыянальныя пачуцьці эўрапэйцы не саромеюцца цяпер толькі на спартовых трыбунах. Стадыён — гэта завод, прызначаны для экалягічна бясьпечнай утылізацыі нацыяналізму.

* * *

Вэрбальная мова нарадзілася зь інтэрфэрэнцыі гукавых сыгналаў, запазычаных людзьмі ў суседзяў па лесе. У нашых размовах дагэтуль утрымліваецца пэўная доля рыку ці мыканьня, аднак і ў галасах жывёлаў мы падсьвядома шукаем знаёмыя словы. Памятаю, на дні нараджэньня ў калегі паглядзець на гасьцей прыйшоў ягоны сабака — невысокі, амаль што кішэнны. Я ўзяў яго на рукі, прылашчыў і штосьці сказаў. Нечакана сабака адказаў мне ціхім скавытаньнем. Пад жарты сяброў мы пачалі сьпяваць разам: я шаптаў, мармытаў, падвываў і раптам адчуў, што мы ўжываем адну і тую чалавеча-жывёльную трасянку. Здаецца, я сапраўды разумеў, што мне кажа сабака, толькі вось ня ведаю, пра што сам яму распавёў.

* * *

З гледзішча сабакі амаль усе людзі — геніі.

* * *

Хатняя жывёла — ужо крыху чалавек, а паколькі ўся Зямля — наш дом, то крыху чалавекападобнай можна лічыць усялякую жывёлу. У некаторых жывёлах можна заўважыць нават нешта хрысьціянскае: дзеці здаўна хаваюць сваіх сабакаў ды котак дзе-небудзь у садзе і ставяць на гэтых магілах маленькі крыжык, каб нябёсны бацька не забыўся пра іхных сяброў. Напэўна, разам з доўгімі пакаленьнямі людзей уваскрэснуць, калі прыйдзе час, і многія іншыя істоты — прынамсі, тая мікрафлёра, што працавала ў кішэчніку нашых продкаў.

* * *

Замест кіпцюроў у нас не пазногці, а пальцы.

* * *

Калі б чалавек не адпілаваў сука, на якім сядзеў, — так і застаўся б малпаю.

* * *

Дзе птушкі — там і самалёты.

* * *

Калі на падлогу зваліласяя лустка каўбасы, я падняў яе, паднёс да самых вачэй, але так і ня ўцяміў — арол альбо рэшка?

* * *

Кампазытар складае музыку ня толькі з таго, што ён чуе навокал сябе, але і з таго, чым закусвае.

* * *

Рот мімаволі напаўняецца сьлінаю, калі стаматоляг прасоўвае ў яго свае пальцы. Напэўна, ёсьць у іх штосьці апэтытнае…

* * *

Калі доўга трымаць суразмоўцу за горла — можна навучыцца разумець яго паводле трымценьня пальцаў на шыі. Глухому, каб рэгуляваць інтанацыю і сілу голасу, даводзіцца трымаць за горла самога сябе.

* * *

Сеў за пісьмовы стол, разгарнуў кнігу, два сшыткі, нататнік: раблю выпіскі, зьвяраю, сачыняю сам — і заўважаю раптам, наколькі падобныя нататнік і сшыткі на разяўленыя дзюбы схаваных пад паверхняю стала велічэзных птушанятаў, якія прагна патрабуюць новых думак, малюнкаў ці хоць бессэнсоўных крамзоляў. Старонка запаўняецца — глыток — і апусьцелая дзюба ізноў расчыняецца наўсьцяж… Часам страшна дакранацца да паперы: схопіць нечакана руку — і пракаўтне.

* * *

Хацеў прыхлопнуць  камара, а апляваху даў сабе самому.

* * *

Карціну, вядома, можна напісаць любымі фарбамі, але ўсё ж такі пажадана, каб яна атрымалася крыху сьвятлейшая за звычайныя ўспаміны і фантазіі чалавека, які яе купіць ці атрымае ў падарунак. Добра, калі твор здольны выглядаць бліскучым аскепкам шкла сярод іншага сьмецьця.

* * *

З вандроўкі ў замежжа мы вяртаемся амаль як з таго сьвету — з пасьвятлелымі думкамі і крыху больш даверлівым позіркам. Сьвядомасьць — гэта топкае люстэрка: у ёй яшчэ доўга мігціць водбліск паралельнай прасторы, у якой пасьпеў крыху прыжыцца. Здаецца, што суайчыньнікі таксама размаўляюць на мове краіны, зь якой ты вярнуўся, але кажуць немаведама што.

* * *

Цалкам матэрыяльная для нас рэчаіснасьць — ня больш чым схематычная карта неўяўляльна хутчэйшага і глыбейшага сьвету, якую накрэсьліў хтосьці з тых, што жывуць паверхам вышэй.

* * *

Хрыстафор Калюмб амаль да скону сваіх дзён быў упэўнены, што адкрыў не Амэрыку, а новы шлях у Азію. Але што, калі памыліліся і тыя астраномы, якія адкрылі калісьці нашую плянэту, і мы з вамі жывем не на Зямлі, а на зусім іншым нябёсным целе?

* * *

Падчас выбараў і рэфэрэндумаў падлічваюцца галасы толькі паўналетніх і яшчэ жывых грамадзянаў. Між тым няма ніякага сумневу, што грамадзтва не магло б існаваць без нябожчыкаў і герояў мастацкіх твораў, бяз рэчаў (прынамсі, зробленыя чалавечай рукою), хатніх жывёлаў і культурных расьлінаў. І часам шкада, што іх не запрашаюць на выбары.

* * *

У офісе абароннага заводу, дзе я калісь працаваў, па сталах і падлозе нахабна сноўдаліся прусакі. Ніякая атрута іх не палохала. Для нас гэтае памяшканьне было толькі месцам працы, а для прусакоў — радзімаю.

* * *

Калі фатаграфаваліся ўсім адзьдзелам на працы з нагоды нейкага сьвята, фатограф пасьміхнуўся: “Нават на каленях ты на дзьве галавы вышэйшы за тых, што стаяць у поўны рост”. Нічога дзіўнага: я ж узьлез на пісьмовы стол.

* * *

Пакуль мы жывем, нашае мінулае не раствараецца ў цяперашчыне, а назапашваецца слой за слоем накшталт матрошкі. Усярэдзіне, пад покрывам скуры ды іншых пачуцьцёвых органаў, мы застаемся такімі, якімі і былі раней, колькі дзён альбо дзесяцігодзьдзяў таму. Да самай сьмерці кожны застаецца ў чымсьці дзіцём, а яшчэ глыбей — эмбрыёнам.

Чалавек і памірае не ў сваім апошнім узросьце, а адразу ва ўсіх узростах, якія ён пасьпеў (і нават у тых, што не пасьпеў) пражыць. Адпаведна, і нараджаемся мы не ў дзяцінства, а адразу ва ўсё жыцьцё. Усе мы — раўналеткі: кожнаму і два гады, і дзевяноста два.

* * *

Буда кажа, што ў нас — людзей, жывёлаў, іншаплянэтнікаў — адно жыцьцё і адна душа на ўсіх. Так і ёсьць, але чалавеку аднаго жыцьця замала.